

Жыве Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№64 (1081) 5 красавіка 1995 г. Серада. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 533805 экз. Кошт у розніцу — 150 руб.



ФАКС

* ФАКТЫ * АРГУМЕНТЫ * КОММЕНТАРИИ * СОБЫТИЯ *

Вкратце

Комитет государственной безопасности Беларуси не предпринимал и не предпринимает каких-либо действий, направленных на вмешательство в избирательную кампанию по выборам депутатов Верховного Совета и в местные органы представительной власти.

Об этом заявил руководитель пресс-службы КГБ Беларуси Владимир Кужанов.

❑

Президент Международного комитета Красного Креста Корнелио Соммаруга прибыл в Армению.

Он заявил, что в ходе встреч с руководством Армении намерен обсудить "вопросы, касающиеся обмена военнопленных и заложников, которые находятся на территории Азербайджана и Нагорного Карабаха". Через два дня К.Соммаруга направится в Грузию и Азербайджан.

❑

Курс российского рубля по отношению к доллару США на торгах Московской межбанковской валютной биржи 4 апреля снизился на 12 пунктов, до 4920 рублей за доллар.

Стали богаче мы... лесом

Окончился очередной государственный учет лесного фонда, который проводится в Беларуси раз в 5—6 лет.

Общая площадь лесопокрытых земель увеличилась по сравнению с 1988 годом на 405,8 тысячи гектаров и составляет сегодня 8676,1 тысячи гектаров. Удельный вес спелых лесов возрос с 2,6 до 4,8 процента. Общий запас древесины в стране достиг 1 095 100 тысяч кубометров. Улучшение состояния лесного фонда произошло благодаря повышению уровня управления лесным хозяйством, более четкому выполнению технологических требований по охране и защите "зеленого друга".

Александр ВЛАДИМИРОВ.

Нет худа без добра...

Витебское производственное объединение "Доломит" вышло из государственного подчинения и превратилось в открытое акционерное общество.

— Другого пути нет, — заявил на конференции представителей служб и цехов генеральный директор "Доломита" В.Григорьев. — Выпуск известковой муки для раскисления почвы за последние годы сократился в 2 с половиной раза, долги за электроэнергию и железнодорожные перевозки приблизились к 30 миллиардам рублей.

Спасти "доломитовую" монополию от полного краха, по мнению администрации, поможет акционирование.

Максим АРХИПОВ.

Суворовцев станет меньше

В нынешнем году не предполагается производить набор суворовцев в Минское СВУ.

Это связано с переходом с трехлетнего на двухгодичный срок обучения. Но ребятам, мечтавшим уже в этом году прикрепить к новенькой форме алые погоны, беспокоиться не стоит. Сделать это они смогут после окончания девяти классов в следующем году. Хотя стать суворовцем будет нелегко, поскольку набор уменьшится в связи с сокращением армии. Кроме того, признано целесообразным вернуться к принципу, который закладывался изначально при образовании суворовских училищ: бесплатно учить и содержать тех, кто в этом нуждается особо остро — сирот, детей из многодетных семей. Их и следует принимать в СВУ в первую очередь.

Сергей ВЕРЕЩАК.

Весна на дороги беду позвала

Как сообщили агентству РИД в областном Управлении ГАИ, за минувшую неделю на дорогах Минщины произошло 11 ДТП, в которых 5 человек погибли, одиннадцать — получили ранения.

Всего за март было зарегистрировано 53 дорожных происшествия, в которых 22 человека погибли, сорок восемь были ранены. За месяц задержано 10 "хмельных" водителей.

С начала года на дорогах области произошло 191 ДТП, отнявшее жизнь у 60 и принесшее увечья и травмы 180 их участникам. "Змию" за рулем "поддались" 25 водителей.

Сергей РАСОЛЬКО.

агенцтва Графуова

Курсы обмена наличных валют
в коммерческих банках
на 4 апреля
тел./факс (0172) 325-105 1995 г.

НАИМЕНОВАНИЕ БАНКА	Доллар США		Немецкая марка		Российск. рубль		Телефоны для справок
	Покупка	Продажа	Покупка	Продажа	Покупка	Продажа	
1. ООО "ВЕРОНИКА"***	11230	11500	7950	8300	2.20	2.30	067
2. БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК	11200*	11850	8135*	8605	2.00	2.40	267-022
3. БЕЛАРУСБАНК	11293*	11615*	7880*	8282*	2.00*	2.70*	239-250
4. БЕЛБИЗНЕСБАНК (гл. операц. управ.)	11200*	11650	7900*	8250	1.70	2.40	067
5. НАРОДНЫЙ БАНК	11150	11550	7880	8250	2.12	2.32	238-610
6. "ИНТЕРКОНТИНЕНТАЛЬ-СКВ"	11200	11500	7800	8400			293-095
7. СБЕРБАНК	11150 11200**	11550 11650**	7800	8200	1.80	2.25	067
8. "ОЛИМП"	11100*	11450*	7592*	8063*	2.00*	2.28 2.35**	508-556
9. "ДУКАТ"	11200	11500	7900	8400	2.00	2.60	201-063
10. "БЕЛБАЛТИЯ"	11250	11500	7850	8300	2.00	2.25	
11. "ИНТЕК"	11450*	11900*	7800*	8100*	1.80	2.30	688-037
12. ПРИОРБАНК	11400 11450**	11650	8000 8040**	8550	1.50	2.50	690-964
13. МИЛАВИЦА филиал АКБ "ДУКАТ"	11300*	11650	7800	8400	1.90	2.30	372-825
14. БЕЛБИЗНЕСБАНК (гор. дирекция)	11150	11500	7950	8250	2.00	2.30	
15. ВЕЛЕС филиал АКБ "ДУКАТ"	11300 11500**	11550	8000 8300**	8300		2.50	
16. филиал № 1 банка "ОЛИМП"	11350*	11730*	7900*	8300*			291-646 067
17. "ЕВРОПЕЙСКИЙ"	11250 11300**	11500 11750**	7700*	8200*	2.10*	2.30*	270-166
18. МАГНАТБАНК ф-л 001	11200*	11600*			2.00	2.20*	
19. ЭЛИТБАНК	11250	11450	7900	8250	1.50	2.00	

*-Возможна операция за наличный и безналичный расчет;
**-Операция проводится только по безналичному расчету;
***-Операция с СКВ свыше 1000$ производится на договорных условиях

We are here for your service:

Tickets/ ... 79 17 45
reservation ... 79 18 57

Cargo ... 79 19 51
Fax ... 79 17 21



Lufthansa

Minsk

BelaPAN Co.

Все на субботник!

8 апреля в Минске пройдет общегородской субботник. Как сообщили агентству РИД в Мингорисполкоме, уже создан штат по его проведению. Для уборки и благоустройства белорусской столицы будут привлечены коммунальные службы города, рабочие и служащие заводов, население.

В общей же сложности для уборки потребуется гораздо больше одного дня, и поэтому Мингорисполком объявил еще и о проведении с 1 по 30 апреля месячника по наведению порядка на минских улицах.

Александр КАЗАК.

У каждого свой "интерьер"

Необычный заказ получила лидская фирма "Дукат", которая занимается выпуском мебели. В очень сжатые сроки ей предложено оформить интерьер кабинетов, где работает администрация Президента.

А вот работники лидской мебельной фабрики смотрят в сторону дальнего зарубежья. Один из последних контрактов — на 300 тысяч долларов — был заключен со шведской фирмой на производство и поставку серии комодов из натурального дерева.

Александр СЕРГЕЕВ.

Какая разница между кормильцем и снабженцем

В разряд самых высокооплачиваемых на Витебщине вышли в феврале работники материально-технического снабжения и сбыта.

Они получали в среднем, как подсчитали в облстатуправлении, по 679 тысяч рублей. Банкиры, лидировавшие прежде в сводках по зарплате, теперь на втором месте (645 тыс. руб.). На 3-м месте — железнодорожники, не дотянувшие до полумиллионной зарплаты всего 13 тысяч рублей.

Самые бедные, как и прежде, на Витебщине — кормильцы- колхозники (157 тыс. руб.), работники культуры (203 тыс. руб.), учителя (255 тыс. руб.) и врачи (256 тыс.). Последние, видимо, просто не умеют работать за двоих-троих, как снабженцы или банкиры.

Александр ТУЛБУСОВ.

Солдат — не пушечное мясо

Потери в частях Брестского гарнизона стали явно превышать допустимые пределы, если таковые вообще в мирное время имеются.

Считанные дни прошли после трагической гибели офицера-подрывника — и вот новая беда. Во время ночных стрельб на военном полигоне под Брестом наводчик боевой машины пехоты рядовой Т., потеряв ориентацию, прошил из 30-миллиметровой пушки соседнюю БМП. Два члена экипажа погибли, не дослужив до увольнения в запас считанные месяцы.

Василий САРЫЧЕВ.

Спорт-экспресс

Сегодня стартует второй круг чемпионата Беларуси по футболу. В этом туре встретятся: "Молодечно" — "Обувщик", "Динамо" (Бр) — "Локомотив", "Ведрич" — "Торпедо" (Мн), "Бобруйск" — "Шахтер", "Днепр" — "Торпедо" (Мг), "Динамо-93" — "Динамо" (Мн), "Гомсельмаш" — "КИМ". Завтра состоится встреча между бобруйским "Шинником" и гродненским "Неманом".

❑

В этом месяце у штабквартиры ООН в Нью-Йорке в пятый рз состоится торжественный старт Бега Мира, проводимого раз в два года. Эстафета пройдет по многим городам и странам, а в ночь на 6 июня факел начнет свой путь по белорусской земле. Кстати, каждый желающий может стать участником эстафетной команды.

❑

Открылся 3-й чемпионат Беларуси по хоккею. В первом туре хоккеисты минского "Тивали" переиграли "Бельсталь" из Жодино — 9:0, "Полимир" (Новополоцк) — "Торпедо" (Мн) — 10:5, "Юность" (Мн) — "Неман" (Гродно) — 2:6.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Интерфакс, Белинформ, БелаПАН, РИД.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

"Аўтарамонтны не мае патрэбы ў канверсii"

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў 3 красавіка Мінскі аўтарамонтны завод. Яго суправаджалі міністр абароны Анатоль Кастэнка і старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда Уладзімір Бойка.



Мэтай візіту кіраўніка дзяржавы стала жаданне бліжэй пазнаёміцца з уменнем гэтага калектыву нават у цяперашні цяжкі час трымацца "на плаву" і задавальваць заказы спажыўцоў. Сустракаючыся з рабочымі ў цэхах завода, Аляксандр Лукашэнка звяртаў іх увагу на рэзервы вытворчасці і магчымасці выпуску новай прадукцыі. Сведчаннем таго з'яўляецца аўтамабіль "УАЗ", які нядаўна асвоілі завадчане. З улікам таго, што на ім устаноўлены больш эканамічны дызельны рухавік, аўтамабіль абяцае стаць канкурэнтаздольным у рэспубліцы і на рынках СНД. Цана гэтай навінкі цалкам прымальная і не перавышае 32 мільёнаў беларускіх рублёў.

Прэзідэнт з задавальненнем адзначыў імкненне калектыву зніжаць выдаткі вытворчасці, якія адбіваюцца на канчатковай цане прадукцыі. Такая палітыка, на яго думку, зацікавіць новых заказчыкаў і знізіць вастрыню эканамічных праблем. Больш таго, прадпрыемства не мае патрэбы ў дарагой канверсіі. Тут без асаблівых намаганняў можна выконваць шматлікія заказы сельскіх вытворцаў па аднаўленню іх зношанага аўтатрактарнага парка. Гэта дае магчымасць пераждаць цяжкі час, атрымаць фінансавыя сродкі для асваення рэсурсазберагаючых тэхналогій.

Сур'ёзнай крыніцай інвестыцый можа стаць Міністэрства сацыяльнай абароны, калі прадпрыемства зможа ў сціслыя тэрміны стварыць простую і надзейную каляску для інвалідаў і ветэранаў, паставіўшы на яе гатовы рухавік мотавелазавода. І для такога вырашэння праблемы тут ёсць магчымасці.

Пакідаючы прадпрыемства, Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу на праблемы канверсіі. Ён падзякаваў завадчанам за тое, што яны змаглі захаваць калектыў і па-дзяржаўнаму вырашаюць пытанні развіцця вытворчасці. Ваенныя ведамствы Беларусі і Расіі па-ранейшаму маюць патрэбу ў заказах абароннай прамысловасці і яе перапрафіляванне трэба вырашаць без рэвалюцыйнай спешкі.

Белінфарм.

Событие дня

Черный день фондов — Президент принял самые жесткие меры воздействия

Распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У мэтах забеспячэння выканання актаў заканадаўства, якія рэгулююць дзейнасць інвестыцыйных фондаў, што акумулірують імянныя прыватызацыйныя чэкі "Маёмасць", і абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян Рэспублікі Беларусь Кабінету Міністраў Рэспублікі Беларусь у месячны тэрмін правесці праверку дзейнасці такіх фондаў.

Па выніках праверкі прадставіць справаздачу і ўнесці адпаведныя прапановы Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

Да прыняцця Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь рашэння па выніках праверкі забяспечыць прыпыненне выдадзеных названым фондам ліцэнзій на ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці па каштоўных паперах (дзейнасць інвестыцыйнага фонду) і ліцэнзій на дзейнасць з імяннымі прыватызацыйнымі чэкамі "Маёмасць".

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А.ЛУКАШЭНКА.

27 сакавіка 1995 г.
г.Мінск. № 47РП

Редакция пока не располагает исчерпывающей информацией о причинах, побудивших Президента принять самые жесткие меры воздействия по отношению к специализированным инвестиционным фондам (СИФам).

Известно, что проблему изучала представительная комиссия. В поле ее зрения попали многие фонды. С точки зрения Прокуратуры 20 из них работают по необоснованно выданным лицензиям.

Достаточно сенсационно выглядит информация о первом инвестиционном фонде. Из нее следует, что против председателя правления А.Саманкова возбуждено уголовное дело по ст. 91-1 УК Республики Беларусь (хищение в особо крупных размерах). Расследование ведется управлением внутренних дел Мингорисполкома.

Пикантно звучит и утверждение о том, что родители председателя правления первого инвестиционного фонда стали совладельцами некоторых крупных предприятий.

Понятно, что до решения суда никто не может обвинить ни Саманкова, ни его родителей в противозаконных деяниях. Но обнародование фактов уже сыграло свою роль. Подорвана вера в благие намерения инвестиционных фондов.

Вдобавок почти ежедневно с телеэкрана и страниц московских газет мы получаем информацию о мошеннических комбинациях акционерных обществ, о создании партий обманутых граждан. В таких условиях у обывателя формируется предубеждение против рыночной экономики вообще и против инвестиционных фондов в частности.

Создается впечатление, что Министерство по управлению государственным имуществом и приватизации не сумело своевременно анализировать процесс и не смогло своевременно поддерживать полезное, отметая авантюрное и вредное.

Прокуратура, например, выявила, что по договору с АО "Гермес-Бел" гражданин В.Ш. распространял акции российской компании "Гермес-Союз". Мингосимущество при выдаче справки-разрешения на открытие специального (чекового) счета в Октябрьском отделении Сбербанка г.Минска не выяснило, чьи акции будут продаваться, имеется ли разрешение на ввоз в Республику Беларусь ценных бумаг российского концерна "Гермес", зарегистрированы ли они в Госинспекции по ценным бумагам, взяты ли на учет в АО "Гермес-Бел".

Поразительно, но Мингосимущество, отозвав по причине перечисленных нарушений свое разрешение (выразив таким образом почтение к прокуратуре), через некоторое время вновь выдало его. Хотя ни одно из нарушений не было устранено. Неужели на чиновников из министерства столь благотворно действовала телевизионная и прочая реклама концерна "Гермес"?

Безусловно, инвестиционные фонды представят свои доводы и расчеты. Мы готовы познакомить с ними читателей.

Решительность, с которой приняты меры воздействия, вызывает противоречивые чувства. Не пострадает ли из-за нарушителей законов здоровая идея, не рухнет ли процесс приватизации, не выбьют ли почву из-под ног у нарождающегося класса собственников, хозяев? Ведь без настоящего хозяина земля пуста...

Андрей НИКОЛЬСКИЙ.

Вясна-95: на Мінскі кірмаш прылятаюць госці

Віктар ЧАРНУШЭНКА

Дзесятая юбілейная Міжнародная універсальная ярмарка "Мінскі кірмаш. Вясна-95" распачне сваю работу 10 красавіка ў двух выставачных павільёнах — "Мінскэкспа" і Палацы спорту.

У самай буйной на Беларусі выставе на гэты раз прымуць удзел больш як 300 розных фірм з 15 краін. Асноўны, самы прадстаўнічы раздзел кірмашу, — тавары народнага спажывання. Як адзначыў адзін з арганізатараў кірмашу кіраўнік выставачнага таварыства "Экспафорум" Аляксандр Савін, такая грандыёзная выстава будзе садзейнічаць інтэграцыі беларускай эканомікі ў еўрапейскую супольнасць. Павышаны інтарэс да нас маюць перш за ўсё Германія, Англія, Італія, Швецыя... Цікавы праект узаемавыгаднага супрацоўніцтва ў галіне турызму прапануе, напрыклад, невялікая астраўная дзяржава Мальта.

Яшчэ адна важная дэталь: большая частка (каля 65 працэнтаў) удзельнікаў ярмаркі — вытворцы, астатнія — гандлюючыя фірмы.

Размышление после выставки

Чем мы хуже датчан?

Владимир САМОЙЛОВ

Мы едва ли не опускаемся на колени, когда просим снизить цены на энергоносители, которых нам приходится закупать за рубежом 90 процентов от потребности. До хрипоты спорим, чем нам можно, а чем нельзя поступиться ради дополнительных поставок нефти и газа. Но в то же время почти закрываем глаза на то, что энергозатраты на единицу валового общественного продукта в Беларуси в 2—3 раза выше, чем в других странах. И если так будет продолжаться, в нашем разорении будет некого упрекать, кроме самих себя.

Идти другим путем советуют устроители и участники закончившейся вчера выставки "Энергоресурсосбережение". И не просто советуют, а предлагают реальные пути сбережения огромного количества энергоресурсов, а значит, реальные возможности выхода из экономического кризиса.

Что поразило во время посещения выставки? Прежде всего ощущение, что государству в целом, кажется, вся эта экономия "до лампочки". Кстати, о лампочках. Придумали на заводе "Калибр", а может, и не придумали, а у кого-то переняли оригинальные светильники, которые по дизайну выглядят по-европейски, но, самое главное, экономят энергии в два-три раза больше по сравнению с обыкновенными бытовыми лампочками. И служат в несколько раз дольше. Об этом с гордостью рассказал сотрудник Комитета по энергосбережению и энергетическому надзору. И тут же сообщил, что Брестский электроламповый завод совсем не горит желанием осваивать выгодную для всей экономики новинку. У него и так лампы берут, а чем чаще они сгорают, тем выгоднее заводу.

Еще одна новинка — гелиоколлекторный модуль, разработанный НПО "Белсельхозмеханизация". Он позволяет использовать солнечную энергию для подогрева воды в домах и на фермах. Модуль, что важно, прост в изготовлении и потому дешевый. Окупает себя достаточно быстро, давая с апреля по сентябрь приличную экономию электрической или тепловой энергии. А значит, экономит ту же нефть. Взять бы и наладить крупносерийный выпуск новинки. Но, кажется, скорее прогниют и рухнут крыши наших ферм, чем появятся на них в массовом количестве гелиосистемы.

Тоже НПО разработало новый охладитель молока, использующий в качестве энергии даровой естественный холод атмосферного воздуха, что позволяет снизить в осенне-зимний период энергозатраты на этот широко применяемый технологический процесс в 5—7 раз по сравнению с традиционным холодильным оборудованием. Но руководители хозяйств не слишком пока рвутся экономить. Все равно все затраты если не покупатель, то государство покроет.

Пожалуй, самое большое количество потерь энергии в наших домах. Они напоминают решето, через которое уходит тепло.

В среднем каждая квартира потребляет в год около двух тонн условного топлива. Это долларов двести. Но есть пути реально сэкономить. Для этого придется не только ставить счетчики, утеплять окна, но и, возможно, обшивать дома снаружи теплоизоляционными материалами. И тут пригодится тепловизор, изготавливаемый витебской фирмой "Диполь", который с расстояния в несколько десятков метров определяет утечку тепла.

Говорят, в Дании энергетический кризис, подобный нашему, случился в начале восьмидесятых. Датчане не стояли ни перед кем на коленях, выпрашивая дополнительную нефть, а прикинули, как снизить расход энергоносителей. И снизили в два раза. И при этом еще значительно увеличили промышленное производство. Чем мы хуже?

Развітанне з Піменам Панчанкам

Сваёй эпохі пасынак і сын
Яе любіў і ненавідзеў шчыра.
Бывала й лераю жабрачай ліра,
І весялухай зманлівых часін.

З самім сабой
Самазабойны бой.
Не правадыр,
А павадыр сумневу
Больш давяраў
Свайму глухому гневу,
Які з дзвярэй лагоды
Рваў прабой.

Ён д'яблу не заклаў сваю душу,
І грэшнік, і пакутнік утрапёны.
Пегас прыстаў.
Як шыбельні, страмёны.
І правіць мова родная імшу...

Рыгор БАРАДУЛІН.

Беларусь—Польшча: яшчэ адзін крок да супрацоўніцтва

Учора Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Мечыслаў Грыб прымаў афіцыйную дэлегацыю Рэспублікі Польшча на чале з Маршалам Сената Адамам Струзікам.

Падчас сустрэчы размова ішла аб эканамічным, палітычным і гандлёвым супрацоўніцтве паміж дзвюма суседнімі дзяржавамі. Бакі адзначылі, што нашы адносіны развіваліся даволі дынамічна. Аб гэтым сведчыць хаця б той факт, што тавараабарот склаў крыху больш за чвэрць мільярда долараў. Больш актыўна з Беларуссю супрацоўнічаюць толькі дзелавыя колы Германіі.

— Але ва ўзаемаадносінах нашых краін, — адзначыў Струзік, — далёка не ўсе рэзервы вычарпаны. Трэба знаходзіць новыя формы работы. Спачатку расшырыць, няхай сабе сёння і не вельмі прагрэсіўны, бартэр. Добра было б, калі б дамоўленасці заключаліся пры пасрэдніцтве дзяржаў напрамую паміж прадпрымальнікамі і камерсантамі.

Беларускі бок выказаў надзею, што Польшча будзе дапамагаць нам інтэгравацца ў так званы блок цэнтральнаеўрапейскіх дзяржаў, дзе заходнія суседзі маюць вялікі ўплыў.

Абмяркоўваўся шэраг іншых узаемавыгадных пытанняў.

Віктар ХАРОШКА.

Падзяка за віншаванні

Сардэчна дзякую ўсім, хто даслаў свае віншаванні з нагоды майго 60-годдзя. Малітоўна жадаю ўсім здароўя, міру, Божай дапамогі і благаслаўлёных поспехаў у добрых справах.

ФІЛАРЭТ,
Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі,
Патрыяршы Экзарх
усяе Беларусі.

Актуальна!

“Служба выратавання” як шанц супрацьстаяць злачыннасці

Віктар ЧАРНУШЭНКА

У мінулым годзе была самая вялікая за ўсю гісторыю нашай дзяржавы колькасць злачынстваў — 121,7 тысячы, што на 16,5 працэнта больш, чым у папярэднім. Адкрыты зварот калегіі МУС да ўсяго насельніцтва краіны сведчыць аб тым, што адны толькі праваахоўныя органы сваімі сіламі не здольныя навесці парадак. Яны вымушаны звярнуцца па дапамогу да альтэрнатыўных службаў бяспекі, хуткага рэагавання, да ўсяго насельніцтва. Успомнілі нават пра ДНД, якіх заўчасна спісалі з рахунку. Пачуты нарэшце голас асацыяцыі “Насельніцтва за бяспеку”, якая даўно выказвае вельмі слушную прапанову...

Але напачатку прывяду фрагмент з крымінальнай рэчаіснасці. Неяк ад'язджаў я з Брэста. Каля граніцы выцягнуўся грузавы аўтакараван з Германіі. Яго ўзялі ў “палон” дзве хуткасныя “Шкоды-фаварыт”. Восем дужых узброеных ахоўнікаў у камуфляжнай форме занялі свае месцы ў калоне, і яна рушыла ў бок Мінска, затым — да расійскай граніцы.

Пасля даведаўся, што гэта былі нашы хлопцы, але не з міліцыі, а супрацоўнікі прыватнай службы бяспекі “Свэлтан”. Дарэчы, усе яны раней служылі ў органах унутраных спраў і звольніліся па ўласнаму жаданню. Заняцца суправаджэннем грузаў і пасажыраў праз Беларусь іх прымусіла адна прычына — рост злачыннасці на дарогах. Акрамя службы “Свэлтан” ды яшчэ аднаго-двух агенцтваў бяспекі, ніхто больш не займаецца гэтай справай. Рабаўніцтва, асабліва ноччу, стала звычайнай з'явай. Большасць такіх злачынстваў застаюцца нераскрытымі.

Нядаўна на сустрэчы ў Брэсце прадстаўнікоў службаў бяспекі краін Еўропы і СНД шмат гаварылася пра еўраканвой — суправаджэнне транспарту праз увесь кантынент, цеснае ўзаемадзеянне прыватных ахоўных службаў і паліцыі. Наспеў час стварыць нацыянальную службу выратавання — па тыпу “тэлефона выратавання 911” — ”жоўтых анёлаў” на дарогах. Чалавек можа трапіць у самую неверагодную экстрэмальную сітуацыю, стаць пацярпеўшым і быць сведкам злачынства. Ён павінен разлічваць не толькі на міліцыю, але і на іншыя службы тэрміновай дапамогі — медыцынскую, пажарных, тых жа прыватных дэтэктываў...

Дзякуй Богу, што УУС сталіцы, здаецца, прыйшло да разумення, што такая служба выратавання неабходная і нам, і пачало ўсталёўваць больш цесны кантакт з асацыяцыяй і службамі бяспекі.

Конституционный суд без работы не останется

13 апреля 1995 года в Конституционном суде Республики Беларусь начинается слушание дела о соответствии Конституции трех указов Президента Республики Беларусь.

Это указ N 19 от 4 августа 1994 года “О создании Управления делами Президента Республики Беларусь” в той его части, где речь идет о передаче издательства “Белорусский Дом печати” Управлению делами, а также указы N 27 от 5 августа 1994 года “О создании Национальной государственной телерадиокомпании Республики Беларусь” и N 128 от 28 сентября 1994 года “Вопросы Национальной государственной телерадиокомпании”, утвердивший Положение о ней. Дело было инициировано группой депутатов Верховного Совета в количестве 84 человек. Суду предстоит исследовать и решить, произошла ли в республике после издания названных указов Президента монополизация средств массовой информации и было ли нарушено конституционное право граждан на получение полной, достоверной и своевременной информации. Группу депутатов Верховного Совета в Конституционном суде будут представлять С.И.Наумчик и И.И.Герменчук. Слушание дела, возможно, продлится несколько дней.

Конституционный суд также возобновил приостановленное 30 сентября 1994 года производство по делу о соответствии Конституции и законам Республики Беларусь пунктов 3 и 7 указа Президента Республики Беларусь N 19 от 4 августа 1994 года “О создании Управления делами Президента Республики Беларусь”, согласно которым на Управление делами возложено финансовое и материально-техническое обеспечение Верховного Совета и переданы в его ведение здание и имущество Верховного Совета. Дело возбуждалось по предложению Председателя Верховного Совета М.И.Гриба и было приостановлено 30 сентября 1994 года по его просьбе до рассмотрения в Верховном Совете проектов законов “О Верховном Совете Республики Беларусь” и “О Президенте Республики Беларусь”. В настоящее время эти законы приняты Верховным Советом и вступили в силу.

Олег МОСКАЛЕВ, пресс-центр Конституционного суда Республики Беларусь — специально для агентства РИД.

ВЯЧЭРНЯЯ ШКОЛА

Колькі каштуе невуцтва?

Леанід ПУСКІН, педагог

Запытайце пра вячэрнюю школу выпадковых людзей. Многія ўпэўнены, што яна даўно скanала. Але “вячорка”, хаця з вялікімі стратамі, па-ранейшаму працуе. Праўда, зусім у новай якасці. Зараз яна мае справу не з дарослымі людзьмі і нават не з працоўнай моладдзю. Яе навучэнцы — 15—17-гадовыя падлеткі, якіх масавая школа рэгулярна і ў масавым парадку выкідае за парог як нядбайных і нядольных. Мы іх падбіраем. Большасць з іх нідзе не працуе — хто сёння “малалетцы” дасць работу?

Многім з нашых падапечных яшчэ ў дзяцінстве адбілі ахвоту да вучэння, і яны проста не ўмеюць (таму і не жадаюць) займацца разумовай працай. Нямала падлеткаў прыходзіць да нас з ужо заробленым “тытулам” правапарушальніка. Для такіх “вячорка” часам — апошні прытулак. Яна дапамагае ім утрымацца ў жыццёвай каляіне, пазбегнуць турмы. Ці ачуняць пасля яе. Але, відаць, мала таго, што “вячорка”, як можа, перавучвае, а трэба — дык і перавыхоўвае старшакласнікаў. У апошнія гады дзённая школа бессаромна “сплаўляе” ў яе нават 13—14-гадовых “малькоў”. Трывожны феномен: пры жывых бацьках і дзяржаве, у мірны час на Беларусі расце і маладзее падлеткавая беспрытульнасць.

Вось з якім “спецкантынгентам” мае зараз справу вячэрняя школа. Яе асноўная функцыя — выпраўленне браку, наробленага сям'ёй і масавай школай. Наша “армія выратавання” працуе там і з тымі, у каго яшчэ не абуджаны здольнасці ці ўжо маральна пашкоджана душа. Або цела — нашы дзверы адчынены і для інвалідаў.

Многія педкалектывы прыйшлі да пераканання: невялікі гонар цэлыя тры гады “карміць” толькі ведамі нашых непрацуючых “караедаў”. І адначасова з адукацыйнай сталі арганізоўваць для іх і прафесійную падрыхтоўку — на базе ПТВ, вучэбна-вытворчых камбінатаў, прадпрыемстваў і г.д. Каб тая паслужыла ім выратавальным кругам у дарослым жыцці. Ды і ў перыяд навучання дала б магчымасць трохі падзарабіць. Першай пачала гэту справу Гомельшчына. Ніхто не прымушаў вячэрнюю школу ўсцягваць на свае кволыя плечы чужую работу. Педагогаў прымусіла зрабіць гэта сумленне і клопат пра будучае сваіх пестуноў. Быў у іх і свой, “скурны” інтарэс. Прыстасаванне “вячоркі” да патрэб часу дазваляла ёй выжыць самой.

Вось чым займаецца зараз вячэрняя школа. На жаль, у ёй не бачаць вялікай патрэбы некаторыя з нашых селекцыянераў, якія захапіліся работай са здольнай моладдзю. Вось узялі ды з наскоку правялі летась конкурсны адбор вучняў масавай школы ў 10-я класы. І адразу ж узнікла праблема са значнай часткай учарашніх 9-класнікаў, якія “праляцелі” міма тэхнікумаў, ПТВ і нават вячэрняй школы. І ва ўмовах беспрацоўя аказаліся на вуліцы.

Яшчэ два-тры падобныя “залпавыя выкіды” — і нас чакае маладзёжны Чарнобыль. Бо ў грамадстве набіраецца “крытычная маса” з тых “запушчаных” хлапцоў і дзяўчат, якіх штогод губляе наша сістэма адукацыі. Колькі іх, уваходзячых у “групы рызыкі” пасынкаў дзяржавы, хто кінуў вучыцца і не пачаў працаваць, бадзяецца сёння паміж намі? А колькі іх будзе заўтра?

Гультайства разбэшчвае. Не даючы кожнаму юнаку рэальнай магчымасці прадоўжыць пасля 9-га класа навучанне, набыць спецыяльнасць, самому пачаць зарабляць на жыццё, мы параджаем у яго спакусу здабыць сродкі для існавання крымінальным шляхам. Фактычна мы штурхаем яго на гэты шлях, праграмуем будучую “пасадку”. Нездарма міжнародны Камітэт па правах дзіцяці выказаў нядаўна занепакоенасць яўнай неадпаведнасцю азначанага ў заканадаўстве рэспублікі ўзросту заканчэння абавязковага навучання (15 гадоў) і мінімальнага працаздольнага ўзросту (16 гадоў).

Краіне не абысціся без нацыянальнай праграмы падрыхтоўкі падлеткаў, асабліва “нестандартных”, да самастойнага жыцця. Яе састаўляючыя: вучоба — прафесія — працаўладкаванне — вольны час. Будуць у малых галовы і рукі заняты карыснай справай — менш будуць дурэць. Неабходна павялічыць колькасць адукацыйна-прафесійных устаноў, у тым ліку і вячэрніх школ, пашырыць іх функцыі. А таксама пачаць рэзерваваць (купляць) для “непаўналетак” рабочыя месцы, — што ніколі ў нас не рабілася. І жорсткі кантроль за выкананнем праграмы, тым больш — у наш крызісны час. Але ці збіраецца маладая каманда, прыйшоўшая да ўлады ў нашай маладой дзяржаве, праводзіць маладзёжную палітыку, скіраваную на спыненне масавага “падзяжу” маладняку?

А на “вячорку” ўсё вешаюць усіх, з кім самі не справіліся... Яна і цягне. Дык дапамажыце ёй тады ці хаця б не перашкаджайце. Гэта папялушка адукацыі і так у апошнія гады трымаецца ў асноўным на энтузіязме сваіх фанатаў-адзіночак. Дык не: і дагэтуль не даюць нам сумаваць зневажальныя налёты-праверкі, у тым ліку і пракурорскія. Не спыняюцца спробы “экспрапрыіраваць” будынкі вячэрніх школ. Вунь і Мінскі электрамеханічны завод, былы шэф 24-й школы, што калісьці выдзеліў ёй корпус (каб пасадзіць за парты сваіх рабочых), і той патрабуе сваю ўласнасць назад. Рынак.

І, канешне, усе на нас, на “крайніх”, жадаюць сэканоміць, — займаемся ж “пустой” справай! Некаторыя чыноўнікі ад адукацыі прапануюць: “Пераходзьце на платнае навучанне!” Маўляў, не здолелі гэтыя невукі скончыць звычайную школу — хай выкладаюць грошы. Але ж ці толькі яны ды іх бацькі ў тым вінаватыя? Мо прыклала да гэтага руку і “учительница первая моя”? А ўжо што сама сістэма (у тым ліку і адукацыі) “залячыла” многіх нашых “пацыентаў” — гэта бясспрэчна. І потым: за што сёння нам плаціць? Вячэрняя школа, як і раней, забяспечваецца па т.зв. “рэштkaваму прынцыпу”, і яе матэрыяльная база даволі ўбогая. Бедны асартымент паслуг, які яе работнікі могуць прапанаваць на продаж. Зазірніце ў 19-ю сталічную, калісьці легендарную, “вячорку”. Сэрца сціснецца ад тых зневажальных для чалавека ўмоў, у якіх — на парозе XXI стагоддзя! — б'юцца за нашых “падранкаў” настаўнікі...

Пытанне прынцыповае: дзе гэта відана, каб з саміх “сацыяльна заклапочаных элементаў” спаганяліся б сродкі на іх выпраўленне? За “пераналадку і даводку” юнака ў вячэрняй школе павінен плаціць самы зацікаўлены ў гэтым бок — дзяржава. Уся наша рэабілітацыйна-прафілактычная сістэма павінна быць на яе поўным утрыманні. Гэта прамы абавязак дзяржавы і яе жыццёвы інтарэс — давесці кожнага свайго падданага да неабходнага ўзроўню, пазбегнуць тым самым сацыяльных узрушэнняў. На Захадзе не шкадуюць вялікіх грошай на тое, каб узброіць сваіх “шурыкаў” ведамі, спецыяльнасцю, павагай да закона. І нават прэзерватывам. Някепска адзначыў адзін амерыканскі сенатар: “Вы лічыце, што адукацыя занадта дарагая рэч? Паспытайце, колькі каштуе невуцтва!”.

Пімен Панчанка

Вялікую страту панесла беларуская літаратура — 2 красавіка 1995 года пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр народны паэт Беларусі Пімен Панчанка. Перастала біцца сэрца чалавека, які ўсё сваё жыццё аддаў служэнню роднай Беларусі.



Пімен Емяльянавіч Панчанка нарадзіўся 23 жніўня 1917 года ў г. Таліне ў рабочай сям'і. Яго бацькі, бедныя сяляне, змушаны былі ў пошуках заробку выехаць у Прыбалтыку. Але ўжо ў 1920 годзе сям'я вярнулася ў Беларусь. Тут пачыналіся шляхі-пуцявіны будучага паэта.

У 1934 годзе Пімен Панчанка скончыў педагагічныя курсы ў Бабруйску, а пазней, у 1939-м, — Мінскі настаўніцкі інстытут. Працаваў у школах Кіраўскага раёна на Магілёўшчыне.

З 1939 па 1946 год жыццёвы лёс Пімена Панчанкі звязаны з нялёгкімі салдацкімі дарогамі. На франтах Вялікай Айчыннай вайны — Бранскім, Заходнім, Калінінскім, Паўночна-Заходнім — ён змагаўся як мужны баец і палымяны паэт.

Пасля вайны Пімен Панчанка працаваў у рэдакцыях часопіса “Вожык”, газеты “Літаратура і мастацтва”, быў галоўным рэдактарам часопісаў “Советская Отчизна”, “Маладосць”, сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У складзе беларускай дэлегацыі прымаў удзел у рабоце XIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі, старшынёй Рэспубліканскага камітэта абароны міру. Ён — ганаровы акадэмік Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

Першыя вершы Пімена Панчанкі з'явіліся ў 1934 годзе на старонках кіраўскай раённай газеты і альманаха “Ударнік”. Яны вызначаліся юнацкай узнёсласцю і натхнёнасцю. За гады плённай творчай працы Пімен Панчанка выдаў дзесяткі кніг — вершаў і паэм, перакладаў, публіцыстыкі, успамінаў. Сярод іх: “Упэўненасць”, “Верасnёвыя сцягі”, “Табе, Беларусь!”, “Дарогай вайны”, “Далёкія станцыі”, “Гарачыя вятры”, “Прысяга”, “Кніга вандраванняў і любові”, “Тысяча небасхілаў”, “Чатыры кантыненты”, “Пры святле маланак”, “Размова з наследнікамі”, “Снежань”, “Крык сойкі”, “Вячэрні цягнік”, “Млечны Шлях”, “Маўклівая малітва”, “Дзе начуе жаўранак”, “Лясныя воблакі”, “І вера, і вернасць, і вечнасць”, “Горкі жолуд”, “Неспакой” і многія іншыя. Выходзілі зборы твораў аўтара ў 2-х, 3-х і 4-х тамах.

Шырокае прызнанне атрымала творчасць паэта не толькі на Радзіме, але і за яе межамі. Ён — лаўрэат Дзяржаўнай і Літаратурнай прэмій імя Янкі Купалы, Дзяржаўнай прэміі СССР.

Высока былі адзначаны працоўныя і ратныя заслугі Пімена Панчанкі. Ён узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі і Айчыннай вайны II ступені, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума — “Знак Пашаны”, медалямі.

Пімен Панчанка — паэт яркага таленту, усёй сваёй творчасцю, жыццём знітаваны з народам, з якім ён да апошняга дыхання быў разам і ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны, і ў гады нялёгкай мірнай працы, і ў складаны, поўны супярэчнасцей наш час. Арыенціры яго паэзіі вельмі ясныя і дакладныя: гэта, як ён сам пісаў у аўтабіяграфіі, “праўда жыцця — праўда пачуццяў маіх сучаснікаў, чалавечнасць...” І таму так бескампрамісна змагаўся ён паэтычным словам супраць хлусні, дэмагогіі, прыстасавантства, абыякавасці; і таму з такой пранікліваю задушэўнасцю, чуласцю, пяшчотай, глыбокім пачуццём чалавечнасці ён апяваў свайго сучасніка; і таму так горача любіў свой народ і Радзіму, змагаўся за яе нацыянальнае адраджэнне.

Паэзія Пімена Панчанкі — паэта-грамадзяніна, паэта-патрыёта, прасякнутая людскімі клопатамі і трывогамі, будзе заўсёды з намі.

Будзе жыць у памяці народнай воблік Пімена Емяльянавіча Панчанкі, чалавека шчодрай, багатай душы, чыстага сумлення.

Лукашэнка А.Р., Грыб М.І., Чыгір М.М., Бамбіза І.М., Русакевіч У.В., Сініцын Л.Г., Бутэвіч А.І., Стражаў В.І., Сянько У.Л., Ярмошын У.В., Барадулін Р.І., Брыль І.А., Быкаў В.У., Бураўкін Г.М., Гілевіч Н.С., Навуменка І.Я., Скурко Я.І.(Максім Танк), Чыгрынаў І.Г., Шамякін І.П., Адамчык В.У., Андраюк С.А., Аўрамчык М.Я., Блакіт (Болтач) В.У., Вярцінскі А.І., Гарэцкі Р.Г., Гіль (Гілевіч) М.С., Гніламёдаў У.В., Грахоўскі С.І., Далідовіч Г.В., Дудараў А.А., Жалязоўскі А.П., Законнікаў С.І., Звонак П.Б., Зуёнак В.В., Каваленка В.А., Казько В.А., Кіслік Н.З., Крысько Ц.В.(Васіль Вітка), Кудравец А.П., Ліпскі У.С., Лойка А.А., Лукша В.А., Лучанок І.М., Макаль П.М., Мальдзіс А.І., Някляеў У.П., Паўлаў У.А., Пісьмянкоў А.У., Прыходзька П.Ф., Пташнікаў І.М., Русецкі А.С., Сачанка Б.І., Сіпакоў І.Д., Супрунчук В.П., Сушчэня Л.М., Шабалін А.А.

Несбыточная мечта?

или Почему белорусский Пудун до сих пор не построен?

Олег ГРУЗДИЛОВИЧ, обозреватель “Народной газеты”

(Окончание. Начало в № 63.)

Где вы, эксплуататоры трудового народа?

Сколько писано-переписано про различные привилегии и гарантии, про те калачи и пряники, которыми можно заманить в Беларусь заморских толстосумов! Просмотрите подшивки газет только за последние полгода — белых пятен в этой теме не существует. Причем не только наши специалисты, но и заморские гости знают и подсказывают буквально по пунктам: нужно сделать сначала то, потом это, потом пятое и десятое. И ведь правду говорят! Ну почему бы не прислушаться к их советам, почему бы одним указом или постановлением, или, наконец, законом не решить проблему раз и навсегда? Но не тут-то было! Пока не сломан психологический барьер, пока в каждом из нас — от простого дворника до Президента — сидит эта боязнь оказаться в роли эксплуатируемого, ничего, видимо, не изменится. Беседуешь с иным умным человеком: все понимает, и роль инвестиций осознает, и очень даже желал бы тут их видеть. А потом возьмет и брякнет в конце разговора: “Да они нас считают дешевой рабочей силой!” Причем самое печальное, что это не просто мысль или догадка, но уже и политический лозунг. Посмотрите вокруг: сколько политиков делают себе карьеру на том, что объединяют в партии недовольных и боящихся быть эксплуатируемыми! Работать на еле дышащем родном предприятии за копейки — это ничего, это нормально. А вкалывать у капиталиста за сотню долларов в месяц в то время, как он, сволочь, купается в шампанском, — это жуткое оскорбление. Идут годы, перестройке уже десять лет, независимости нашей скоро пятилетие стукнет, а мы по части боязни эксплуатации — впереди планеты всей! Но ведь и в послевоенной Японии тоже была дешевая рабочая сила, и потому-то японское чудо состоялось. Так же, как южнокорейское и тайваньское. Как испанское, а сейчас на подходе бразильское, индонезийское. Одна за другой развивающиеся страны переходят в разряд развитых, используя потенциал дешевой рабочей силы, которая становится все дороже и дороже. Но постепенно становится, а не вдруг. И только у нас боятся признать, что мы сто́им столько, сколько за нас дают, и, чтобы сто́ить больше, нужно работать на мировом рынке, а не отгораживаться от него стеной. Пока через нашу стену частный западный бизнес перепрыгнуть не может. Нужна приманка, масло на хлеб, намазать которое может только государство. Умное государство просить об этом не приходится. Простой пример: болгарское правительство предлагает выделить миллион долларов в качестве гарантии для инвесторов, которые возьмутся построить в Софии телепорт, аналогичный тому, который планируется разместить в Минске. Вот это называется забота о своих гражданах! О своих, замечу, избирателях и налогоплательщиках.

К вопросу о привилегиях... инвесторов

Теперь, не приводя расхожих аналогий с нашим начальством, давайте разберемся, чего же хотят потенциальные инвесторы проекта Технопарк и насколько реальны их претензии?

Перечень особых прав и привилегий, аккуратно собранных в проект Технопарка, вообще-то немалый — около десяти пунктов. Все перечислить, конечно же, нет возможности, но самое главное сообщу. Например, инвесторы очень бы хотели, чтобы в зоне Технопарка размещалась таможня — всемирный опыт, оказывается, свидетельствует, что это сокращает бизнесменам массу времени и расходов. Конечно же, ограниченными должны быть налоги. Инвесторы хотят платить налог на прибыль не больше пяти процентов — это едва ли не главный стимул для инвестирования. Причем для поощрения вложения в экономику Беларуси ставится вопрос об уменьшении этого налога пропорционально реинвестированию прибыли. И, наконец, ключевое условие — беспошлинный ввоз полуфабрикатов, сырья и безналоговый вывоз товаров Технопарка за пределы республики. Итак, даже при самом поверхностном рассмотрении эти условия “слабыми” не покажутся. В альтруизме западных партнеров обвинять не приходится. Но, с другой стороны, а чего ради им лезть в Богом забытую Беларусь, начинать здесь все с нуля, если не иметь возможности вывезти произведенный здесь продукт и выгодно его продать не только на нашем рынке? По оценкам специалистов, многие крупнейшие западные компании, готовясь к проникновению на бескрайний российский рынок, рассматривают Беларусь как стартовую площадку для этого рывка. Следовательно, нам нужно использовать их желание разместить на нашей территории свои стартовые площадки. Учитывая сравнительно высокий уровень нашей рабочей силы, ее квалификацию и организованность, можно ожидать, что очень дешевой она не будет. Зато после приобретения опыта работы на западном предприятии ее цена резко возрастет. Возьмем такой пример. Известная американская фирма “Купер Маньюфэкчуринг”, специализирующаяся на выпуске и ремонте бурильного оборудования, всерьез вознамерилась сделать Минск своим трамплином в прыжке на Восток и заинтересовалась участием в проекте Технопарка. По расчетам фирмы, странам СНГ потребуется на ближайшие пять лет 2—2,5 тысячи бурильных установок. Освоение этого заказа даст фирме 15 миллиардов долларов оборота. А это значит, что несколько десятков миллионов долларов окажутся в нашем бюджете только в качестве налога, без учета поступлений от сдачи объектов и земли в аренду и прочих услуг. Помимо того, что “Купер” собирается развернуть у нас свое производство, создать центр обучения, что обеспечит сотни высокооплачиваемых рабочих мест, наши предприятия будут получать от фирмы заказы на 15—20 миллионов долларов ежегодно. Вот такой небольшой примерчик...

Понятно, что фирмам нужны не только привилегии, но и гарантии. Прежде всего, что инвестиции не будут национализированы. Что вмешательство в их деятельность со стороны государства будет исключено. Что со временем предприятия Технопарка смогут приобрести землю, на которой построились. За это они гарантируют быструю отдачу в виде финансовых поступлений в бюджет, начиная уже с первого года деятельности предприятия.

Итак, в проект Технопарка гарантии и привилегии заложены. Одна договаривающаяся сторона с ними согласилась (кстати, не без риска, который даже на этих условиях составляет до 30 процентов). Самое любопытное, что и вторая сторона, наша, вроде бы не против. На деловых встречах и саммитах белорусские официальные лица не устают повторять, что нет более заинтересованной в инвестициях страны, чем Беларусь. Но как только заходит речь о конкретных решениях, тут словно внезапно наступает затмение, и концов не найти.

Белорусская трагедия

